ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова прэзідыума Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі
09.01.2024 № 1/1

ПАЛАЖЭННЕ
аб Падзяцы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзенае Палажэнне рэгулюе пытанні дзейнасці Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (далей – Прафсаюз) па ўзнагароджанні Падзякай Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза (далей – Падзяка).

2. Падзяка з’яўляецца формай узнагароджання:

2.1. работнікаў, навучэнцаў арганізацый адукацыі, ветэранаў працы галіны – членаў Прафсаюза;

2.2. арганізацыйных структур Прафсаюза;

2.3. іншых асоб і арганізацый.

3. Падзякай узнагароджваюцца за важкі ўклад у рэалізацыю статутных задач Прафсаюза, удасканаленне форм і метадаў прафсаюзнай работы, іміджу Прафсаюза і прафсаюзнага руху, сацыяльна-эканамічнае развіццё галіны цераз якасную рэалізацыю значных праграм, інфармацыйнае асвятленне дзейнасці Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Прафсаюза, плённае правядзенне акцый, мерапрыемстваў, дапамогу ў ажыццяўленні праектаў Прафсаюза.

4. Пытанні ўзнагароджання Падзякай у рамках правядзення навукова-практычных канферэнцый, конкурсаў, фестываляў, спартакіяд і г.д. пад эгідай Прафсаюза рэгулююцца адпаведнымі пастановамі, палажэннямі.

5. Форму бланка Падзякі зацвярджае прэзідыум Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК ПРАДСТАЎЛЕННЯ КАНДЫДАТУР

6. Прадстаўленне кандыдатур да аб’яўлення Падзякі могуць ажыццяўляць:

6.1. старшыня Прафсаюза, яго намеснікі, члены прэзідыума

Рэспубліканскага камітэта, аддзелы Прафсаюза шляхам накіравання прэзідыуму Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза адпаведнага прадстаўлення або службовай запіскі;

6.2. абласныя (Мінскі гарадскі) камітэты Прафсаюза, аб’яднаны прафсаюзны камітэт работнікаў НАН Беларусі, прафсаюзныя камітэты пярвічных прафсаюзных арганізацый, якія знаходзяцца на прафсаюзным абслугоўванні ў Прафсаюзе, шляхам накіравання прэзідыуму Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза:

суправаджальнага пісьма;

рашэнне кіруючага органа адпаведнай арганізацыйнай структуры Прафсаюза аб хадайніцтве перад прэзідыумам Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза;

прадстаўленне на фірмовым бланку.

7. Да асоб, кандыдатуры якіх прадстаўляюцца да ўзнагароджання Падзякай, прад’яўляюцца наступныя патрабаванні:

7.1. стаж дзейнасці ў Прафсаюзе не менш двух гадоў;

7.2. наяўнасць заахвочванняў Прафсаюза ці ўзнагарод арганізацыйных структур Прафсаюза і іншых арганізацый;

7.3. дасягненні ў актывізацыі і пашырэнні прафсаюзнага руху, удасканаленні форм і метадаў прафсаюзнай работы.

8. Да арганізацыйных структур Прафсаюза, якія прадстаўляюцца да ўзнагароджання Падзякай, прад’яўляюцца наступныя патрабаванні:

8.1. высокі узровень ахопу прафсаюзным членствам і (ці) колькасны рост прафсаюзнай арганізацыі, іншыя паказчыкі дынамікі яе развіцця;

8.2. наяўнасць заахвочванняў Прафсаюза ці ўзнагарод арганізацыйных структур Прафсаюза, ў прафсаюзнай арганізацыі і (ці) яе прадстаўнікоў і іншых арганізацый;

8.3. высокі ўзровень сацыяльнага партнерства.

9. Дакументы да ўзнагароджання Падзякай прадстаўляюцца у адрас Прафсаюза ў тэрмін не пазней за месяц да правядзення чарговага пасяджэння прэзідыума Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза.

10. Прадстаўленне да аб’яўлення Падзякі афармляецца на беларускай мове.

11. Падрыхтаваныя з парушэннямі ўстаноўленага парадку дакументы вяртаюцца адпаведным арганізацыйным структурам Прафсаюза для дапрацоўкі.

12. Паўторнае ўзнагароджанне Падзякай праводзіцца у тэрмін не менш, чым за два гады з даты папярэдняга ўзнагароджання, іншы тэрмін дапускаецца пры наяўнасці выключных заслуг прадстаўленай кандыдатуры, арганізацыйнай структуры Прафсаюза у гэты перыяд.

# ГЛАВА 3
# ПАРАДАК УЗНАГАРОДЖАННЯ

10. Рашэнне аб аб’яўленні Падзякі прымаецца прэзідыўмам Рэспубліканскага камітэта Прафсаюза шляхам выдання адпаведнай пастановы.

11. Падрыхтоўку праекту пастановы аб аб’яўленні Падзякі, афармленне яе бланкаў, занясенне дадзеных асоб, якім аб’яўлена Падзяка, у банк адпаведных дадзеных ажыццяўляе галоўны спецыяліст Прафсаюза.

12. Уручэнне Падзякі ва ўрачыстай абстаноўцы забяспечвае Прафсаюз, арганізацыйныя структуры Прафсаюза, якія хадайнічалі аб аб’яўленні Падзякі.

13. Запіс аб аб’яўленні Падзякі заносіцца ў працоўную кніжку, асабістую справу.

14. Асобам, якім аб’яўлена Падзяка, разам з яе бланкам выдаецца грашовая ўзнагарода ў памеры трох базавых велічынь, арганізацыйнай структуры Прафсаюза - ў памеры чатырох базавых велічынь за кошт сродкаў Прафсаюза, калі іншае не ўстаноўлена адпаведнай пастановай.